Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

Факультет начального образования
Кафедра белорусского и русского языкознания
(рег. № УД-27-3-176-2023)

**СОГЛАСОВАНО**
Заведующий кафедрой
белорусского и русского языкознания
________ Н.М.Антонович
27.09. 2023 г.

**СОГЛАСОВАНО**
Декан факультета
начального образования
________ Н.В.Жданович
27.09. 2023 г.

ЭЛЕКТРОННЫЙ УЧЕБНО-МЕТОДИЧЕСКИЙ КОМПЛЕКС
ПО УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЕ
**«МЕТОДИКА ОБУЧЕНИЯ ГРАМОТЕ И КАЛЛИГРАФИЯ»**
для специальности 1-01 02 01 Начальное образование

Составители: Антонович Н. М., кандидат педагогических наук, доцент
Свириденко О. И., кандидат педагогических наук, доцент

Рассмотрено и утверждено
на заседании Совета БГПУ 5 октября 2023 г.
Протокол № 1

# СОДЕРЖАНИЕ

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА ........ 4

ТЕОРЕТИЧЕСКИЙ РАЗДЕЛ ........ 6

Лекцыйныя заняткі № 1. Лінгваметадычныя і псіхолага-педагагічныя асновы навучання грамаце ........ 6

Лекцыйныя заняткі № 2. Асноўныя асаблівасці сучаснага гукавога аналітыка-сінтэтычнага метаду навучання грамаце ........ 8

Лекцыйныя заняткі № 3. Тыпалогія і структура ўрокаў навучання грамаце. Патрабаванні да ўрокаў навучання грамаце ........ 11

Лекцыйныя заняткі № 4. Змест і методыка работы па чытанні ў падрыхтоўчы перыяд навучання грамаце ........ 13

Лекцыйныя заняткі № 5–6. Змест і методыка работы па чытанні ў асноўны перыяд навучання грамаце ........ 15

Лекцыйныя заняткі № 7. Змест і методыка работы па чытанні ў заключны перыяд навучання грамаце ........ 19

Лекцыйныя заняткі № 8. Развіццё маўлення на ўроках навучання чытанню ........ 21

Лекцыйныя заняткі № 9. Змест навучання пісьму ў падрыхтоўчы, асноўны і заключны перыяды навучання грамаце ........ 23

Примерный перечень заданий управляемой самостоятельной работы студентов по учебной дисциплине ........ 25

История развития и сопоставительный анализ методов обучения грамоте ........ 25

ПРАКТИЧЕСКИЙ РАЗДЕЛ ........ 26

Практическое занятие № 1. Основные особенности современного звукового аналитико-синтетического метода обучения грамоте ........ 26

Практическое занятие № 2. Содержание и методика работы по чтению в подготовительный период обучения грамоте в учреждениях образования с русским языком обучения ........ 26

Практическое занятие № 3. Содержание и методика работы по чтению в подготовительный период обучения грамоте в учреждениях образования с белорусским языком обучения ........ 27

Практическое занятие № 4. Содержание и методика работы по чтению в основной период обучения грамоте в учреждениях образования с русским языком обучения ........ 28

Практическое занятие № 5. Содержание и методика работы по чтению в основной период обучения грамоте в учреждениях образования с белорусским языком обучения ........ 29

Практическое занятие № 6. Содержание и методика работы по чтению в заключительный период обучения грамоте в учреждениях образования с русским языком обучения ........ 29

Практическое занятие № 7. Содержание и методика работы по чтению в заключительный период обучения грамоте в учреждениях образования с белорусским языком обучения ........ 30

Практическое занятие № 8. Развитие речи на уроках обучения чтению ........ 31

Практическое занятие № 9. Контрольно-оценочная деятельность педагога и учащихся в процессе обучения чтению ........ 32

Практическое занятие № 10. Моделирование уроков письма в подготовительный период обучения грамоте. Отработка каллиграфически правильного написания элементов букв ....... 33

Практическое занятие № 11. Методы и приёмы обучения письму. Отработка каллиграфически правильного написания букв, содержащих овал, полуовал ....... 33

Практическое занятие № 12. Моделирование уроков письма в основной период обучения грамоте. Отработка каллиграфически правильного написания букв, содержащих прямую с закруглением вверху, прямую с закруглением внизу, прямую с закруглением вверху и внизу ....... 34

Практическое занятие № 13. Моделирование уроков письма в заключительный период обучения грамоте. Отработка каллиграфически правильного написания букв, содержащих прямую ....... 35

Практическое занятие № 14. Типичные графические ошибки учащихся, пути их предупреждения и устранения. Отработка каллиграфически правильного написания букв, содержащих прямую с петлей внизу, прямую с петлей вверху ....... 36

Практическое занятие № 15. Грамматико-орфографическая пропедевтика на уроках обучения письму. Отработка каллиграфически правильного написания букв, содержащих прямую с петлей вверху и закруглением внизу, прямую с малым овалом ....... 37

Практическое занятие № 16. Контрольно-оценочная деятельность педагога и учащихся в процессе обучения письму. Отработка каллиграфически правильного написания букв, содержащих плавную линию ....... 38

Практическое занятие № 17. Совершенствование навыка каллиграфического письма во 2–4 классах. Закрепление каллиграфически правильного написания букв ....... 39

Примерный перечень заданий управляемой самостоятельной работы студентов по учебной дисциплине ....... 41

Развитие речи на уроках обучения чтению ....... 41

Методы и приёмы обучения письму. Отработка каллиграфически правильного написания букв, содержащих овал, полуовал ....... 41

Моделирование уроков письма в основной период обучения грамоте. Отработка каллиграфически правильного написания букв, содержащих прямую с закруглением вверху, прямую с закруглением внизу, прямую с закруглением вверху и внизу ....... 41

Совершенствование навыка каллиграфического письма во 2–4 классах. Закрепление каллиграфически правильного написания букв ....... 42

РАЗДЕЛ КОНТРОЛЯ ЗНАНИЙ ....... 43

Примерный перечень вопросов к экзамену ....... 43

ВСПОМОГАТЕЛЬНЫЙ РАЗДЕЛ ....... 45

Учебная программа учебной дисциплины ....... 45

Перечень учебных изданий, рекомендуемых для изучения учебной дисциплины ... 82

# ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Основная функция электронного учебно-методического комплекса по учебной дисциплине «Методика обучения грамоте и каллиграфия» – обеспечение студентов I ступени высшего образования по специальности 1-01 02 01 Начальное образование материалами для самостоятельного изучения дисциплины и подготовки к экзамену.

Основные цели электронного учебно-методического комплекса:

– сформировать у студентов умения правильно организовывать учебно-воспитательный процесс и управлять познавательной деятельностью учащихся в период обучения грамоте в учреждениях общего среднего образования с русским и белорусским языками обучения;

– помочь студентам овладеть теоретико-методическими знаниями по формированию навыков каллиграфического письма у младших школьников, практическими умениями каллиграфически правильного письма;

– воспитывать нравственные и профессионально-значимые качества, необходимые преподавателю, прививать творческое отношение к труду;

– развивать научно-исследовательские способности, совершенствовать навыки грамотной организации самостоятельной работы с научно-методической литературой;

– способствовать формированию у студентов готовности к постоянному самообразованию, профессиональному и личностному саморазвитию.

Электронный учебно-методический комплекс по учебной дисциплине «Методика обучения грамоте и каллиграфия» включает четыре раздела: теоретический, практический, контроля знаний, вспомогательный.

В теоретическом разделе раскрываются научные основы обучения грамоте, вопросы, связанные с методикой обучения первоначальному чтению и письму. Представлен перечень заданий для управляемой самостоятельной работы студентов по теме «История развития и сопоставительный анализ методов обучения грамоте».

В практическом разделе представлены вопросы для рассмотрения и обсуждения на практических занятиях, задания, связанные с анализом учебных программ по учебным предметам «Обучение грамоте», «Навучанне грамаце», букварей и прописей для учреждений общего среднего образования с русским и белорусским языками обучения, с разработкой фрагментов и конспектов уроков обучения чтению и письму (на русском и белорусском языках). Также имеются материалы, которые помогут организовать самостоятельную работу студентов и сформировать профессионально-методические навыки в организации процесса обучения первоначальному чтению и письму, усовершенствовать навыки каллиграфически правильного письма студентов.

В разделе контроля знаний содержатся материалы, которые помогут студентам дневной и заочной форм получения образования подготовиться к промежуточной аттестации.

Вспомогательный раздел включает учебную программу по учебной дисциплине «Методика обучения грамоте и каллиграфия» и перечень учебных

изданий, которые можно использовать при подготовке к лекциям и практическим занятиям.

# ТЕОРЕТИЧЕСКИЙ РАЗДЕЛ

## Лекцыйныя заняткі № 1. Лінгваметадычныя і псіхолага-педагагічныя асновы навучання грамаце

**План лекцыі**

1. ***Значэнне і задачы працы па навучанні грамаце ў сістэме моўнай адукацыі.***
2. ***Лінгвістычныя асновы навучання грамаце.***
3. ***Псіхолага-педагагічныя асновы навучання грамаце.***

**1.** Навучанне грамаце – пачатковы этап сістэматычнага вывучэння беларускай мовы, які закладвае аснову лінгвістычнага і разумовага развіцця вучняў.

*Задачы навучання грамаце:*

развіццё фанематычнага слыху;

фарміраванне правільнага вымаўлення гукаў мовы, засваенне літар; развіццё ўмення суадносіць літары з адпаведнымі гукамі;

навучанне першапачатковаму чытанню і пісьму;

развіццё цікавасці да чытання, фарміраванне чытацкага кругагляду, уменняў працы з разнастайнымі крыніцамі інфармацыі;

узбагачэнне слоўнікавага запасу, развіццё звязнага вуснага маўлення;

фарміраванне ўменняў вучэбнай дзейнасці.

**2.** Навучанне ў школе пачынаецца з элементарнага чытання і пісьма. Чытанне і пісьмо – віды маўленчай дзейнасці чалавека, а навыкі чытання і пісьма – гэта маўленчыя навыкі. Яны (навыкі) фарміруюцца ў непарыўным адзінстве з іншымі відамі маўленчай дзейнасці – з вуснымі выказваннямі, са слыхавым успрыманнем чужога маўлення, з унутраным маўленнем.

*Механізм чытання.*

Інфармацыя, якой чалавек карыстаецца ў сваёй дзейнасці, закадзіраваная. У вусным маўленні выкарыстоўваецца гукавы код, У пісьмовым маўленні прымяняецца літарны код, у якім літары суадненсены з гукамі першага кода. Пераход з аднаго кода на другі называецца перакадзіраваннем.

Механізм чытання заключаецца ў перакадзіраванні друкаваных (або пісьмовых) знакаў і іх комплексаў у сэнсавыя адзінкі, у словы. Пісьмо ўяўляе сабой працэс перакадзіравання сэнсавых адзінак маўлення ва ўмоўныя знакі або іх комплексы, якія могуць быць напісаны або надрукаваны.

*Лінгвістычныя асновы навучання грамаце.*

Фанетыка і графіка – гэта лінгвістычная аснова навучання грамаце. Яны знаходзяцца ў складаных узаемаадносінах, і навучанне грамаце трэба будаваць з улікам гэтых узаемаадносін.

Беларускае і рускае пісьмо – гукавое, дакладнае, фанемнае (фанематычнае). Гэта значыць, што кожнаму асноўнаму гуку маўлення, або кожнай фанеме, у графічнай сістэме мовы адпавядае свой знак – графема.

Методыка навучання грамаце ўлічвае асаблівасці беларускай (або рускай) фанетычнай сістэмы.

**3.** Нельга навучаць школьнікаў грамаце, не ўяўляючы чытанне і пісьмо ў элементах, якія складаюць гэтыя дзеянні. Разгледзім гэтыя элементы.

*Чытанне.* Вопытны чытач не спыняецца позіркам на кожнай літары і на кожным слове: у яго поле чытання трапляе адразу 2 – 3 словы. Позірк чытача рухаецца па радку рыўкамі, спыняецца на радку 3 – 4 разы. Усведамленне тэксту адбываецца ў час прыпынкаў. Вопытны чытач схватвае словы па іх агульным выглядзе. Вопытнаму чытачу не трэба чытаць услых: ціхае чытанне адбываецца ў 1,5 – 3 разы хутчэй гучнага, а разуменне тэксту аказваецца вышэйшым.

*Працэс чытання ў дзіцяці, якое пачынае навучацца грамаце.*

“Поле чытання” такога чытача ахоплівае ўсяго 1 літару. Працэс чытання ідзе павольна, бо для таго, каб прачытаць слова, трэба выканаць столькі актаў успрымання і пазнавання, колькі літар у слове, да таго ж яшчэ трэба зліць гукі ў склады, а склады – у словы.

Вочы чытача нярэдка губляюць радок.

Такі чытач не заўсёды лёгка ўспрымае сэнс прачытанага. Вялікая ўвага надаецца тэхнічнаму боку чытання, і да таго моманту, як слова прачытана і вымаўлена, школьнік не паспявае яго ўсвядоміць.

Для нявопытнага чытача характэрна ўгадванне слова або па аднаму складу, або па малюнку, або па кантэксце. Спробы ўгадваць слова, хаця і вядуць да памылак у чытанні, сведчаць пра тое, што вучань імкнецца чытаць свядома. Найбольшай цяжкасцю пры навучанні чытанню лічаць цяжкасці гуказліцця.

*Пісьмо.* Этапы фарміравання навыку пісьма:

- асэнсаванне слова, успрынятага на слых;
- склада-гукавы аналіз пачутага слова;
- устанаўленне паслядоўнасці гукаў у слове;
- перакадзіраванне гукавой формы слова ў графічную (суаднясенне гукаў з літарамі);
- непасрэднае рухальнае ўзнаўленне на паперы графічнага комплексу.

У дарослага чалавека навык пісьма аўтаматызаваны. Дарослы рэдка звяртае ўвагу на напісанне і злучэнне літар, на правапіс, аўтаматычна прытрымліваецца радка і пераносіць словы, амаль не задумваючыся. Яго ўвага скіравана на змест, стыль і пунктуацыю. Яму не трэба рабіць свядомыя намаганні, выконваючы тэхнічны бок пісьма.

*Працэс пісьма ў дзіцяці, якое пачынае навучацца грамаце.*

У першакласніка гэты працэс раскладаецца на мноства самастойных дзеянняў. Ён павінен сачыць за сабой, каб правільна трымаць ручку, пакласці сшытак. Калі дзіця вучыцца пісаць літару, яно павінна ўспомніць яе форму, элементы, размясціць яе на радку. Яно павінна памятаць, як трэба сядзець. Названыя дзеянні патрабуюць ад вучняў свядомых намаганняў. Гэта не толькі запавольвае тэмп пісьма, але і стамляе навучэнца. Гэтым абумоўлена неабходнасць правядзення ў ходзе ўрока спецыяльных практыкаванняў для рук.

**Літаратура**

1. Методика обучения русскому языку и литературному чтению : учебник и практикум для вузов / Т. И. Зиновьева [и др.] ; под ред. Т. И. Зиновьевой. – М. : Издательство Юрайт, 2023. – 468 с.
2. Методика преподавания русского языка в начальных классах : учеб. пособие / М. Р. Львов, В. Г. Горецкий, О. В. Сосновская. – 2-е изд., испр. – М. : Изд. центр «Академия» 2002. – 464 с.
3. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.

## Лекцыйныя заняткі № 2. Асноўныя асаблівасці сучаснага гукавога аналітыка-сінтэтычнага метаду навучання грамаце

**План лекцыі**

1. ***Асноўныя рысы сучаснага гукавога аналітыка-сінтэтычнага метаду навучання грамаце.***
2. ***Асаблівасці выкарыстання гукавога аналітыка-сінтэтычнага метаду навучання грамаце на сучасным этапе букварыстыкі.***
3. ***ВМК па вучэбных прадметах «Обучение грамоте», «Навучанне грамаце».***

**1.** Гукавы аналітыка-сінтэтычны метад навучання грамаце з’яўляецца самым эфектыўным метадам, паколькі з навуковых пазіцый ён дае магчымасці паслядоўна і паспяхова пераадольваць усе цяжкасці ў працэсе навучання дзяцей пісьму і чытанню ў перыяд авалодання імі граматй. Асноўныя рысы метаду:

- навучанне грамаце прадугледжвае развіццё маўлення навучэнцаў;
- асновай навучання грамаце з’яўляецца *гук*;
- адзінкай чытання з’яўляецца *склад;*
- навучанне грамаце адбываецца па перыядах: падрыхтоўчы (дабукварны), асноўны (букварны), паслябукварны (заключны);
- навучанне чытанню і пісьму адбываецца паралельна;
- пры ўстанаўленні паслядоўнасці вывучэння літар улічваецца прынцып частотнасці;
- прапедэўтычна ўводзяцца элементы граматыкі, словаўтварэння, арфаграфіі;
- прысутнічаюць элементы мадэлявання;
- навучанне грамаце носіць развіццёвы і выхаваўчы характар;
- рэалізуюцца індывідуальны і дыферэнцыраваны падыходы да вучняў.

**2.** Вучэбны дапаможнік “Буквар” (“Букварь”) для 1 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай (рускай) мовай навучання і выхавання распрацаваны ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай “Навучанне грамаце” (“Обучение грамоте”), зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. У якасці зыходных пазіцый для распрацоўкі буквароў

выкарыстоўваюцца асноўныя палажэнні *кампетэнтнаснага, лінгвакультуралагічнага, камунікатыўна-дзейнаснага і асобасна арыентаванага падыходаў*.

Рэалізацыя кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні грамаце азначае ўлік таго, што буквар – асобы падручнік, па якім вучань авалодвае спосабам здабывання ведаў – вучыцца чытаць.

У сістэму работы па буквары ўключаюцца выхаваўчыя задачы, рашэнне якіх прадугледжваецца праз знаёмства з культурным значэннем вывучаемых моўных адзінак. Гэта звязана з рэалізацыяй лінгвакультуралагічнага падыходу ў навучанні грамаце.

Пры вызначэнні паслядоўнасці вывучэння гукаў і літар улічваецца, якая лексіка ў першую чаргу патрэбна на пачатковым этапе навучання чытанню, якія літары патрэбны для яе перадачы на пісьме. Гэта дае магчымасць на самых ранніх стадыях навучання значна павысіць якасць тэкставага матэрыялу і рэалізаваць камунікатыўна-дзейнасны падыход да навучання грамаце.

Буквар прадугледжвае рэалізацыю асобасна арыентаванага падыходу ў навучанні грамаце. Дыдактычны матэрыял буквара накіраваны на развіццё асобы навучэнцаў. Прысутнічае матэрыял для дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі навучання, што звязана са значнымі адрозненнямі ў гатоўнасці да чытання і пісьма першакласнікаў.

Працэс навучання грамаце разглядаецца як пачатак моўнай адукацыі навучэнцаў. Лінгвістычны матэрыял у букварах падаецца ў сістэме. Узровень падачы даступны для разумення навучэнцам 6 – 7-гадовага ўзросту. Адбываецца практычнае знаёмства з асноўнымі моўнымі адзінкамі. Улічваюцца асаблівасці беларускай фанетычнай сістэмы. Вучні атрымліваюць веды пра складовую структуру слова, націск, падзел гукаў на зычныя і галосныя, падзел зычных на цвёрдыя і мяккія, пра націскныя і ненаціскныя галосныя. Улічваецца тое, што арыенціровачная аснова дзеяння чытання пабудавана на прынцыпах беларускай (рускай) графікі.

**3.** Акрамя буквара у склад *асноўных кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу* (ВМК) ўваходзяць вучэбныя дапаможнікі “Пропісь 1”, “Пропісь 2”, “Пісьмо” і вучэбна-метадычныя дапаможнікі для настаўнікаў “Навучанне чытанню ў 1 класе” (у дзвюх частках), “Навучанне пісьму ў 1 класе”.

*Дадатковыя кампаненты* ВМК уключаюць дапаможнікі для вучняў і настаўнікаў: “Рабочы сшытак да Буквара”, “Пропісі з анімацыяй”, “Спадарожнік буквара”, “Пазакласнае чытанне. 1 клас”, “Обучение письму. 1 класс. Наглядный материал”, “Навучанне грамаце. 1 клас. Праверачныя работы”.

**Літаратура**

1. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.

2. Свірыдзенка, В.І. Буквар : вучэбны дап. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – 183 с.

3. Свірыдзенка, В. І. Канцэпцыя вучэбнага дапаможніка «Буквар» для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава // Пачатк. шк. – 2023. – № 6. – С. 15–19.

4. Свірыдзенка, В.І. Навучанне грамаце. 1 клас. Праверачныя работы / В. І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск : Аверсэв, 2023. – 64 с.

5. Свірыдзенка, В. І. Навучанне пісьму ў 1 класе : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава. – Мінск: НІА, 2021. – 240 с.

6. Свірыдзенка, В. І. Навучанне чытанню ў 1 класе, у 2 ч. : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В. І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск: НІА, 2021. – Ч. 1. – 264 с.

7. Свірыдзенка, В. І. Навучанне чытанню ў 1 класе, у 2 ч. : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава. – Мінск: НІА, 2021. – Ч. 2. – 264 с.

8. Свірыдзенка, В.І. Пропісі з анімацыяй / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск : Аверсэв, 2021. – 48 с.

9. Свірыдзенка, В.І. Пазакласнае чытанне. 1 клас : дап. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / уклад. В. І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск : Аверсэв, 2021. – 80 с.

10. Свірыдзенка, В.І. Рабочы сшытак да “Буквара” / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск : Аверсэв, 2021. – 48 с.

11. Свірыдзенка, В.І. Спадарожнік буквара : дап. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – 199 с.

12. Тиринова, О.И. Обучение письму. 1 класс. Наглядный материал : учебное наглядное пособие для учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения / О.И. Тиринова. – Мінск : Аверсэв, 2022. – 8 с. + [48] отд. л. плакатов.

13. Тиринова, О. И. Обучение письму в 1 классе : учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / О. И. Тиринова. – Минск : Аверсэв, 2018. – 256 с.

14. Тиринова, О. И. Обучение чтению в 1 классе : учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения : в 2 ч. / О. И. Тиринова. – Минск : Нац. ин-т образования, 2017. – Ч. 1. – 296 с.

15. Тиринова, О. И. Обучение чтению в 1 классе : учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения : в 2 ч. / О. И. Тиринова. – Минск : Аверсэв, 2017. – Ч. 2. – 287 с.

## Лекцыйныя заняткі № 3. Тыпалогія і структура ўрокаў навучання грамаце. Патрабаванні да ўрокаў навучання грамаце

**План лекцыі**

1. ***Тыпалогія і структура ўрокаў навучання грамаце.***
2. ***Патрабаванні да ўрокаў навучання грамаце.***

**1**. Тыпы ўрокаў у падрыхтоўчы і асноўны перыяды навучання грамаце:
1. Урок знаёмства з новым матэрыялам.
2. Урок паўтарэння і замацавання вывучанага матэрыялу.

Тыпы ўрокаў у заключны перыяд навучання грамаце:
1. Урок абагульнення ведаў па тэме “Алфавіт”.
2. Урок чытання мастацкага твора.
3. Урок праверкі навыку чытання.
4. Урок абагульнення “Развітанне з Букваром” (“Свята Буквара”).

*Прыкладная структура ўрока знаёмства з новым матэрыялам у асноўны перыяды навучання грамаце (навучанне чытанню)*
1. Арганізацыйны этап.
2. Актуалізацыя апорных ведаў.
3. Паведамленне тэмы і мэт урока.
4. Вывучэнне новага матэрыялу.
- Увядзенне новых гукаў у працэсе гукавога аналізу слова (слоў).
- Назіранне над асаблівасцямі гукаў, іх характарыстыка.
- Практыкаванні на развіццё фанематычнага слыху, правільную артыкуляцыю гукаў.
- Знаёмства з новай літарай.
5. Замацаванне новага матэрыялу.
- Чытанне складоў з новай літарай, надрукаваных на дошцы або прадстаўленых у буквары.
- Чытанне слоў, сказаў па буквары. Граматыка-арфаграфічная прапедэўтыка.
- Работа з тэкстам буквара.
6. Работа па развіцці звязнага вуснага маўлення
7. Абагульненне матэрыялу. Падвядзенне вынікаў урока.
8. Рэфлексія.

*Прыкладная структура ўрока знаёмства з новым матэрыялам у асноўны перыяды навучання грамаце (навучанне пісьму)*
1. Этап падрыхтоўкі да засваення новых ведаў і спосабаў дзеянняў.
- Актуалізацыя апорных ведаў.
- Паведамленне тэмы, пастаноўка мэты ўрока.
2. Этап засваення новых ведаў і спосабаў дзеянняў.
- Аналіз графічнай формы вялікай і малой літары.

Супастаўленне друкаваных і рукапісных літар.

Увядзенне паняццяў «вялікая літара», «малая літара».

Абвядзенне па пункціры элементаў літар.

Канструяванне літар з элементаў.

- Увядзенне новага спосабу дзеяння: напісанне малой (вялікай) літары.

Дэманстрацыя настаўнікам напісання літары на дошцы.

Практыкаванне для асваення напрамку руху рукі: пісьмо ў паветры.

Прагляд інтэрактыўнай дэманстрацыі напісання літары.

Трэніровачнае практыкаванне: пісьмо літары праз кальку.

Самастойнае пісьмо вучняў у прописях.

Самакантроль з выкарыстаннем калькі.

Вучні ацэньваюць вынікі работы па крытэрыі «Падабенства з узорам».

Дыферэнцыраваная работа з вучнямі з мэтай адпрацоўкі навыку напісання малой і вялікай літар.

3. Замацаванне. Прымяненне асвоеных спосабаў дзеянняў.

4. Рэфлексіўны аналіз вучнямі вынікаў вучэбнай дзейнасці. Падвядзенне вынікаў урока.

**2.** Патрабаванні да ўрокаў навучання грамаце.

***Агульнадыдактычныя патрабаванні:***

- Адпаведнасць мэты і задач урока вучэбнай праграме па навучанні грамаце.
- Дакладнасць вучэбнай, развіццёвай і выхаваўчай мэт урока.
- Пераемнасць і перспектыўнасць урока, яго сувязь з папярэднімі ўрокамі, месца сярод іншых урокаў па тэме.
- Разнастайнасць метадаў, прыёмаў, сродкаў навучання на ўроку. Выбар найбольш эфектыўных прыёмаў. Выкарыстанне займальнага матэрыялу.
- Рэалізацыя індывідуальнага і дыферэнцыраванага падыходаў у працэсе навучання грамаце.
- Наяўнасць адваротнай сувязі на розных этапах урока.
- Стварэнне ўмоў для развіцця метапрадметных уменняў вучняў.
- Рэалізацыя агульнадыдактычных прынцыпаў.

***Прыватнаметадычныя патрабаванні:***

- Урокі чытання і пісьма праводзяцца ва ўзаемасувязі і ўяўляюць сабой адзінства.
- На кожным уроку чытання і пісьма неабходна прадугледжваць працу па развіцці маўлення вучняў.
- На кожным уроку чытання і пісьма неабходнымі элементамі з’яўляюцца разнастайныя прыёмы гукавога аналізу і сінтэзу.
- Непасрэдная работа па фарміраванні ўменняў і навыкаў чытання і пісьма павінна займаць на ўроку большую частку часу (прыкладна 2/3 урока).

- На ўроках чытання і пісьма неабходна выкарыстоўваць узорны моўны матэрыял.

**Літаратура**

1. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.
2. Свірыдзенка, В. І. Навучанне пісьму ў 1 класе : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава. – Мінск: НІА, 2021. – 240 с.
3. Свірыдзенка, В. І. Навучанне чытанню ў 1 класе, у 2 ч. : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В. І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск: НІА, 2021. – Ч. 1. – 264 с.
4. Свірыдзенка, В. І. Навучанне чытанню ў 1 класе, у 2 ч. : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава. – Мінск: НІА, 2021. – Ч. 2. – 264 с.
5. Тиринова, О. И. Обучение письму в 1 классе : учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / О. И. Тиринова. – Минск : Аверсэв, 2018. – 256 с.
6. Тиринова, О. И. Обучение чтению в 1 классе : учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения : в 2 ч. / О. И. Тиринова. – Минск : Нац. ин-т образования, 2017. – Ч. 1. – 296 с.
7. Тиринова, О. И. Обучение чтению в 1 классе : учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения : в 2 ч. / О. И. Тиринова. – Минск : Аверсэв, 2017. – Ч. 2. – 287 с.

## Лекцыйныя заняткі № 4. Змест і методыка работы па чытанні ў падрыхтоўчы перыяд навучання грамаце

**План лекцыі**

1. ***Методыка работы з асноўнымі моўнымі паняццямі.***
2. ***Паслядоўнасць правядзення гукавога аналізу.***

**1.** Паслядоўнасць работы з асноўнымі моўнымі паняццямі:

- Падрыхтоўка да ўвядзення новага паняцця. Гутарка з мэтай назірання над новай моўнай з’явай.
- Высвятленне ўяўленняў вучняў пра моўную з’яву.
- Удакладненне і канкрэтызацыя ведаў пры выкананні заданняў.
- Абагульненне настаўніка, увядзенне новага паняцця.
- Знаёмства з новым спосабам дзеяння і складанне алгарытму дзеяння.
- Знаёмства са спосабам праверкі.
- Замацаванне ведаў, адпрацоўка ўменняў і навыкаў у працэсе практычнай работы вучняў.

**Пры знаёмстве з паняццем склад** выкарыстоўваюцца наступныя прыёмы:

- параўнанне двух спосабаў вымаўлення аднаго і таго ж слова – па гуках і па складах, поўнасцю і па складах;
- гульня “Адгадай слова” (настаўнік паказвае прадметныя малюнкі, называе першы склад у слове і прапануе вучні дагаварыць склад да цэлага слова);
- стварэнне сітуацыі, калі чалавек несвядома пераходзіць да вымаўлення слова па складах (мадэляванне гульнёвых сітуацый).

Для фарміравання ўмення *вызначаць колькасць складоў у слове* мэтазгодна выкарыстоўваць наступныя прыёмы:

- падлік колькасці ўдараў падбародка аб кісць рукі;
- арыенцір на колькасць галосных гукаў слове;
- вымаўленне слова па складах, якое суправаджаецца воплескамі або ўдарамі далоні па стале.

**Пры знаёмстве з націскам** звяртаецца ўвага вучняў на наступныя прыметы: націскны склад вымаўляецца з большай сілай голасу і больш працяжна.

Спосабы *вызначэння націскнога складу* ў слове: “пазваць” слова; здзівіцца пры вымаўленні слова; запытаць; папераменна перамясціць націск у слове.

Спосаб праверкі правільнасці пастаноўкі націску – папераменная перастаноўка націску ў слове і суаднясенне гучання слова з нормай.

**2.** Пры знаёмстве з гукамі мовы неабходна назіраць над вымаўленнем гука ў слове; правільна артыкуляваць іх; вызначаць асаблівасці гука; характарызаваць гукі.

Прыёмы для адрознівання галосных і зычных гукаў:

- Назіранне за работай органаў маўлення.
- Назіранне за спосабам вымаўлення.
- Назіранне за характарам гучання.
- Здольнасць утвараць склад.

Прыёмы для адрознівання цвёрдых і мяккіх зычных гукаў:

- Супастаўленне па гучанні цвёрдых і мяккіх зычных гукаў.
- Супастаўленне вымаўлення гукаў.
- Назіранне за ўтварэннем і артыкуляцыяй гукаў.

Прыёмы для адрознівання звонкіх і глухіх зычных гукаў:

- Назіранне за слыхавым аналізатарам.
- Назіранне за дзейнасцю галасавых звязак.

**Літаратура**

1. Методика обучения русскому языку и литературному чтению : учебник и практикум для вузов / Т. И. Зиновьева [и др.] ; под редакцией Т. И. Зиновьевой. – М. : Издательство Юрайт, 2023. – 468 с.

2. Методика преподавания русского языка в начальных классах : учеб. пособие / М. Р. Львов, В. Г. Горецкий, О. В. Сосновская. – 2-е изд., испр. – М. : Изд. центр «Академия» 2002. – 464 с.

3. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.

4. Свірыдзенка, В. І. Навучанне чытанню ў 1 класе, у 2 ч. : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В. І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск: НІА, 2021. – Ч. 1. – 264 с.

5. Тиринова, О. И. Обучение чтению в 1 классе : учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения : в 2 ч. / О. И. Тиринова. – Минск : Нац. ин-т образования, 2017. – Ч. 1. – 296 с.

## Лекцыйныя заняткі № 5–6. Змест і методыка работы па чытанні ў асноўны перыяд навучання грамаце

**План лекцыі**

***1. Змест працы па чытанні ў асноўны перыяд навучання грамаце.***

***2. Паслядоўнасць увядзення літар.***

***3. Плануемыя вынікі навучання.***

**1.** *Гукавы аналіз і сінтэз* (аналіз стварае аснову для авалодання чытаннем, сінтэз фарміруе навык чытання).

Прыёмы гукавога аналізу:

- Вылучэнне сказаў з маўлення – падзел сказаў на словы – вылучэнне са сказа слова для аналізу – падзел слова на склады, вызначэнне іх колькасці, вызначэнне націскнога склада – вылучэнне новага гука са склада, яго характарыстыка.
- Спосабы выдзялення новага гука:
  - прыём гукапераймання;
  - выдзяленне са сказа гука-слова;
  - пералік слоў з аднолькавым пачатковым гукам;
  - выдзяленне галоснага, які ўтварае цэлы склад;
  - выдзяленне зычнага з закрытага склада;
  - выдзяленне зычнага з адкрытага склада;
  - дагаворванне слова з апорай на малюнак;
  - выдзяленне глухіх зычных на канцы слоў;
  - выдзяленне звонкіх зычных у пачатку слова са збегам зычных (брама, глобус).
- Пералічванне гукаў у слове і паслядоўнае іх называнне; падлік колькасці гукаў у слове, вызначэнне месца канкрэтнага гука ў гукавой структуры слова; вызначэнне складовага саставу.
- Супастаўленне і параўнанне слоў па гучанні і напісанні.
- Аналіз утварэння гука, яго артыкуляцыі.

Прыёмы гукавога сінтэзу:

- Вымаўленне слова, якое папярэдне было прааналізавана, складанне яго з разразной азбукі; чытанне.
- Утварэнне складовых табліц на аснове галосных і зычных; чытанне гэтых табліц.
- Чытанне слоў па падабенстве.
- Нарашчэнне галосных або зычных у пачатку або ў канцы слова.
- Дабаўленне гука ў сярэдзіне слова.
- Перастаноўка гукаў.
- Перастаноўка складоў.
- Адкідванне гукаў або складоў.
- Дабаўленне склада.

*Паслядоўнасць знаёмства з новай літарай:*

- Гукавы аналіз слоў з мэтай вылучэння новых гукаў (гука).
- Вылучэнне новых гукаў (гука) са слоў, іх артыкуляцыя.
- Выкананне заданняў, накіраваных на развіццё фанематычнага слыху.
- Знаёмства з літарай, якой на пісьме абазначаюцца вылучаныя гукі (гук).
- Знаходжанне месца літары на ленце літар (у касе літар і інш.).
- Выкананне практыкаванняў, накіраваных на запамінанне вобраза літары.
- Выкананне практыкаванняў на распазнанне новай літары.
- На кожным наступным уроку абавязкова арганізуецца паўтарэнне раней вывучаных літар праз дыдактычныя гульні, у працэсе выканання заданняў.

*Этапы фарміравання навыку чытання*

<u>Чытанне складоў.</u>

- Навучанне чытанню прамога склада (“зычны+галосны”). Прыёмы навучання чытанню прамых складоў (чытанне “па падабенстве”, з арыенцірам на галосны, працяжнае вымаўленне зычнага гука і далучэнне да яго галоснага).
- Адпрацоўка чытання прамога склада. Прыёмы навучання: чытанне прапанаваных на дошцы складоў “снежным комам”, у рознай паслядоўнасці, з рознай інтанацыяй; чытанне складоў у буквары; калектыўная і індывідуальная работа па спецыяльна падрыхтаваных складовых табліцах; самастойнае састаўленне вучнямі складоў з літар разразной азбукі, іх чытанне; замена асобных літар у складах і чытанне новых складоў.

<u>Чытанне слоў.</u>

Пры *навучанні чытанню слова* арыенцірам з’яўляецца *склад*.

Для першапачатковага навучання чытанню слоў з новай літарай выкарыстоўваюцца слупкі слоў. Можна прымяняць наступныя практыкаванні ў чытанні: чытанне слоў і тлумачэнне іх лексічнага значэння; чытанне слоў з папярэднім аналізам; чытанне слоў зверху ўніз і знізу ўверх, у розным парадку; выбарачнае чытанне слоў па заданні настаўніка; чытанне слова і складанне з ім

сказа.

Чытанне сказаў і тэкстаў.

На аснове свядомага чытання слоў у вучняў выпрацоўваецца навык свядомага чытання сказаў і тэкстаў. Каб вучань свядома чытаў сказ, ён павінен разумець сэнс кожнага слова ў сказе. З гэтай мэтай арганізуецца чытанне “цяжкіх” слоў, якія сустрэнуцца ў тэксце.

Пры чытанні сказаў і тэкстаў праводзіцца работа па выпрацоўцы навыку выразнага чытання.

Тэкст, змешчаны ў буквары, служыць як для сэнсавага, так і структурнага аналізу прачытанага.

Паслядоўнасць работы з тэкстам буквара:

1. Прагназаванне зместу тэксту па загалоўку (калі ён ёсць).
2. Выразнае чытанне тэксту настаўнікам. Вучні ўважліва слухаюць.
3. Паўторнае павольнае чытанне тэксту настаўнікам. Вучні сочаць па буквары.
4. Самастойнае чытанне тэксту вучнямі шэптам.
5. Чытанне тэксту некаторымі вучнямі ўслых.
6. Работа з тэкстам па пытаннях настаўніка, выбарачнае чытанне сказаў.
7. Суаднясенне зместу тэксту і ілюстрацыі.
8. Суаднясенне зместу тэксту і загалоўка.

Пры арганізацыі працы з букварнымі тэкстамі трэба праводзіць разнастайныя практыкаванні творчага характару: прыдумванне назвы тэксту, расказванне па аналогіі, складанне працягу тэксту, драматызацыя. Важна выпрацоўваць выразнасць чытання.

**2.** Паслядоўнасць увядзення літар у беларускім буквары (аўтары В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава):

- Этап знаёмства з першымі літарамі (*С, Л, М*), якія абазначаюць зычныя гукі.
- Этап знаёмства з першымі літарамі, якія абазначаюць галосныя гукі (А, І, Ы, У).
- Этап знаёмства з літарамі, якія абазначаюць зычныя і галосныя гукі (ў, Г, П, Т, О, Э, Р, Ч, Н, К, й, Я, Ю, Е, Ё, З, В, Б, Ц, ь, Ш, Х, Ж, Д, Ф, з апострафам).

Последовательность введения букв в русском букваре (автор О. И. Тиринова):

- Этап знакомства с буквами, обозначающими гласные звуки.
- Этап знакомства с буквами, обозначающими твёрдые и мягкие согласные звуки.
- Этап знакомства с буквами, обозначающими звуки [й’а], [й’о], [й’у], [й’э].
- Этап знакомства с буквами, которые обозначают непарные твёрдые і мягкие согласные звуки.
- Этап знакомства с Ь иЪ.

**3.** *Прадметныя вынікі навучання:*

вучань распазнае і вылучае зычныя і галосныя гукі;

самастойна падбірае словы з зычнымі і галоснымі гукамі ў зададзенай пазіцыі;

дае характарыстыку гукаў;

распазнае вывучаныя літары сярод іншых літар;

ведае, што у складзе “зычны + галосны” літары ***А, Ы, У, О, Э*** указваюць на цвёрдасць папярэдняга зычнага, а літара ***І, Я, Ю, Е, Ё*** – на мяккасць;

чытае склады, словы, сказы і невялікія тэксты з вывучанымі літарамі.

*Метапрадметныя вынікі навучання:*

вучань прымае вучэбную задачу ўрока, удзельнічае ў калектыўным абмеркаванні яе рашэння;

выкарыстоўвае знакава-сімвалічныя сродкі прадстаўлення інфармацыі;

вызначае падабенства і адрозненне слоў, арыентуючыся на іх гукавы склад і лексічнае значэнне;

аналізуе графічны вобраз літар, вылучае іх асноўныя элементы;

канструюе літары, выкарыстоўваючы розны матэрыял;

складае сказы, невялікія апавяданні па малюнку ці серыі малюнкаў;

*асобасныя вынікі навучання:*

вучань праяўляе пазнавальны інтарэс да вывучэння літар, гульняў з гукамі і літарамі;

праяўляе імкненне навучыцца чытаць склады і словы, жаданне выкарыстоўваць атрыманыя веды і ўменні ў працэсе выканання вучэбных заданняў;

выкарыстоўвае ў маўленні новыя словы, разумее іх лексічнае значэнне;

разважае пра ўчынкі герояў прачытаных апавяданняў;

захоўвае правілы работы ў пары і групе.

**Літаратура**

1. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.
2. Свірыдзенка, В. І. Навучанне чытанню ў 1 класе, у 2 ч. : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В. І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск: НІА, 2021. – Ч. 1. – 264 с.
3. Свірыдзенка, В. І. Навучанне чытанню ў 1 класе, у 2 ч. : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава. – Мінск: НІА, 2021. – Ч. 2. – 264 с.
4. Тиринова, О. И. Обучение чтению в 1 классе : учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения : в 2 ч. / О. И. Тиринова. – Минск : Нац. ин-т образования, 2017. – Ч. 1. – 296 с.

5. Тиринова, О. И. Обучение чтению в 1 классе : учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения : в 2 ч. / О. И. Тиринова. – Минск : Аверсэв, 2017. – Ч. 2. – 287 с.

## Лекцыйныя заняткі № 7. Змест і методыка работы па чытанні ў заключны перыяд навучання грамаце

**План лекцыі**

***1. Змест працы па чытанні ў зключны перыяд навучання грамаце.***

***2. Плануемыя вынікі навучання.***

**1.** У планаванне ўрокаў паслябукварнага перыяду настаўнік уносіць свае карэктывы з улікам вучэбных гадзін, якія засталіся да канца навучальнага года.

Для правядзення аднаго ўрока выкарыстоўваецца вучэбны матэрыял дзвюх або чатырох старонак буквара ў залежнасці ад ўзроўню развіцця ў вучняў навыку чытання. Асобныя тэксты настаўнік можа прапанаваць вучням для ўспрымання на слых.

Асноўная ўвага надаецца выпрацоўцыі навыку правільнага, свядомага і выразнага чытання па складах і цэлымі словамі. Урокі навучання чытанню набліжаюцца па змесце і структуры да ўрокаў літаратурнага чытання ў 2 – 4 класах:

1. Арганізацыйны этап. Паведамленне тэмы ўрока.

2. Чытанне і аналіз твораў:

*Першасны сінтэз.*

*Задачы і змест працы:* падрыхтоўка вучняў да ўспрымання мастацкага твора, знаёмства з канкрэтным зместам, сюжэтнай лініяй, высвятленне эмацыянальнага ўздзеяння твора на школьнікаў.

Практыкаванні: уступная гутарка, паведамленне ці расказ настаўніка, выкарыстанне нагляднасці; першае знаёмства з творам; гутарка з мэтай праверкі першаснага ўспрымання твора.

*Аналіз.*

*Задачы і змест працы:* устанаўленне прычынна-выніковых сувязей у развіцці сюжэта; высвятленне матываў паводзін дзеючых асоб, раскрыццё кампазіцыі твора.

Практыкаванні: выбарачнае чытанне; гутарка, ілюстраванне тэксту; раскрыццё галоўнай думкі твора; падрыхтоўка да выразнага чытання, да чытання па ролях, дыялогаў.

*Другасны сінтэз.*

*Задачы і змест працы:* супастаўленне герояў і ацэнка іх паводзін, учынкаў, высвятленне ідэйнай накіраванасці твора, ацэнка мастацкага твора як крыніцы пазнання навакольнай рэчаіснасці.

Практыкаванні: выразнае чытанне твора вучнямі; заключная гутарка.

3. Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў.

4. Падвядзенне вынікаў урока.

**2.** *Прадметныя вынікі навучання:*

вучань распазнае і вылучае галосныя і зычныя гукі ў пачатку, сярэдзіне і канцы слоў;

дае характарыстыку гукам – галосны / зычны; галосны націскны / ненаціскны; зычны звонкі / глухі; зычны цвёрды / мяккі;

падбірае словы з зададзеным гукам у пэўнай пазіцыі;

